УДК 391

# АДРАДЖЭННЕ ТРАДЫЦЫЙ: СЛУЦКІЯ ПАЯСЫ

*Маркелава А.В.*

*Установа адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі»*
*Філіял «Мінскі радыётэхнічны каледж»,*
*г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

*Навуковы кіраўнік: Саўчанка В.С.– выкладчык вышэйшай катэгорыі*
*дысцыплін сацыяльна-гуманітарнага цыклу*

**Анатацыя.** Вывучэнне гістарычнай спадчыны ўзбагачае ведамі пра гісторыю і нацыянальную спадчыну.Даследванне гісторыі тканых паясоў як носьбіта старадаўняй традыцыі беларускага этнасу.Слуцкія паясы цікавы аб’ект невялікага горада, Слуцка, які мае нацыянальную гістарычную каштоўнасць.

**Ключавыя словы:** тканы пояс, слуцкі пояс, традыцыя.

***Уступ.*** Любоў чалавека да Радзімы ў першую чаргу звязана з гісторыяй роднага краю, з рэчамі, зробленымі і сагрэтымі рукамі яго продкаў. Чым ярчэй і змястоўней веды пра родны край, яго людзей, мінуўшчыну і сучаснасць, тым мацнейшае жаданне даведацца яшчэ больш пра гісторыю і культуру роднай зямлі.Сваёй малой Радзімай я лічу не толькі аг. Танежыцы (месца майго нараджэння, жыцця і вучобы), а яшчэ і месца майго адпачынку – старажытны горад Слуцк, у якім я часта бываю і кожны раз адкрываю для сябе што-небудзь новае.

***Асноўная частка.***На гэты раз мая цікавасць прывяла мяне ў цэнтр горада, а менавіта на вуліцу Максіма Багдановіча. Тут размешчана Слуцкая фабрыка мастацкіх вырабаў, якая набыла новы воблік яшчэ ў 2015 годзе пасля вялікай рэканструкцыі.Ткацтва тут развівалася спрадвеку.Прадукцыя слуцкай мануфактуры была даволі разнастайнай па асартыменту. Тут выраблялiся галуны, тасьма, стужкі, тканіны бытавога і культавага прызначэння. Але галоўную частку вырабаў складалі паясы. У розныя гады дзейнасці прадпрыемства аб’ёмы прадукцыі мяняліся – многае залежыла ад кан’юктуры рынку, тэхнічнай аснашчанасці і фінансавых магчымасцей,змен у тагачаснай модзе.Асаблівай папулярнасцю карыстаўся тканы пояс, які быў неад’емнай часткай нацыянальнага мужчынскага адзення. Ткалі паясы з розных нітак(ільняных, ваўняных, шаўковых з дадаткам сярэбных і залатых). Кожны беларускі мужчына меў некалькі паясоў, прызначаных для розных мэт: для штодзённага (працоўнага), святочнага і абрадавага ўжытку. Увогуле пояс выконваў некалькі функцый.

Першая з іх – ужытковая. На поясе насілі прылады працы (сякеру), каліту (аналаг сучаснай барсеткі). У футаралах на ім насілі грабеньчык, нож, крэсіва, асялок і іншыя дробязі.

Другая функцыя беларускага тканага пояса – яго міфалагічны-міфічны змест. Фальклорныя матывы сведчаць, што беларусы адносіліся да яго як да абярэгу, як бараніў іх ад хвароб, нячыстай сілы, нёс дабрабыт. З поясам звязаны розныя традыцыйныя абрады, гадан-ні, павер’і, замовы. Розных памераў і колераў паясы суправаджалі чалавека ад нараджэння да самай смерці. Напрыклад, павітуха вузкім чырвоным поясам перавязвала спавітае дзіця пасля нараджэння, што сімвалізавала яго ўваход у новае шчаслівае жыццё. Шыкоўныя тка-ныя паясы не шкадавалі пакласці ў труну разам з нябожчыкам. Магічная роля надавалася паясам падчас вяселля: іх дарылі маладой, а яна свае паясы павязвала суджанаму і яго свая-кам. Паясы прыносілі як “ахвяраванні” ў цэрквы і касцёлы, дзе яны захаваліся да нашых дзён.

Паясы, якія выраблялiся на слуцкай мануфактуры, не былі аднастайнымі ні па памерах, ні па матэрыялах, ні па мастацкім вырашэнні. У дакументах адміністрацыі персіярні, а таксама Нясвіжскага замка, якія вялі ўлік заказаў, пакупак і падарункаў, называюцца “пояс цэлы”(шырокі), “паўпояс”(вузкі), “пояс перскі”, “пояс тканы золатам”, “пояс шаўковы”, ”пояс літы”.

Практычна заўсёды ў дакументах змяшчаюцца звесткі пра памеры паясоў. Па іх, а таксама па захаваных вырабах можна канстатаваць, што ў сваёй большасці яны мелі ад 300-305 да 330–390 см у даўжыню і ад 28–30 да 35,5 см у шырыню. Аб колькасці каштоўных металаў, якія шлі на некаторыя з паясоў, сведчаць суадносіны агульнай вагі золата ці серабра, што спісваліся па выніках работы. Яна магла складаць ад 65–70 г да 140–200 г на кожны выраб.

Паясы слуцкай работы заўсёды пазначаліся ткацкімі меткамі (сігнатурамі), якія ставіліся на іх канцах з абодвух бакоў справа і злева. Цяпер гэта адзіныя сведчанні, па якіх можна суаднесці канкрэтны захаваны выраб з перыядам дзейнасці прадпрыемства, праса-ыць змены ў мастацкім рашэнні. На тканінах, выкананых у першыя гады дзейнасці мануфактуры можна ўбачыць наступныя: “SLUCK”(рысунак 1), “SLUCIAE FECIT”, “ME FECIT SLUCIAE” (апошнія перакладаюцца як “У Слуцку зроблена”, “Мяне зрабіў Слуцк”). Пазней на метках сталі ставіць “”. Прадукцыя перыяду, калі мануфактурай кіраваў Лявон Маджарскі, а беларускія землі, у тым ліку і Слуцк, увайшлі ў склад Расійскай Імперыі, адзначана наступнымі меткамі: “ЛЕО МАДЖАРСКІ”, “ВЪГРАДЪ СЛУЦКЪ”, “В ГРАДЪ СЛУЦКЪ”.




Рысунак 1 – Тканая метка на слуцкім поясе.

Слуцкія паясы ткаліся з шаўковых нітак, абкручаных найтанчэйшым пласцінчатым дротам. Такія вырабы атрымалі асобую папулярнасць і называліся “літымі”. Выкарыстанне залатой ці сярэбрнай ніці, якая клалася няроўна, надавала вырабам шурпатую, матавую паверхню. Таму гатовы пояс падвяргалі спецыяльнай апрацоўцы – праткавалі праз полыя металічныя валы, у сярэдзіну якіх устаўлялі распаленыя стрыжні. У выніку ніці расплюшчваліся, ствараючы бліскучую і гладкую, нібыта адлітую з металу, паверхню.

Па характару малюнка вырабы слуцкай персіярні можна падзяліць на чатыры віды. Першы складаюць аднабаковыя паясы (маецца знешні і адваротныя бакі) (рысунак 2).



Рысунак 2 – Аднабаковы пояс

Да другога віду адносяцца аднабаковыя двухліцавыя тканіны. Такія паясы складваліся ўдвая па шырыні ва ўсю даўжыню, і кожная з падоўжных палавін з’яўлялася вонкавай (рысунак 3).



Рысунак 3 – Аднабаковы двухлиіцавы

Трэці від складаюць двухбаковыя тканіны (маглі быць трохліцавымі) (рысунак 4).



Рысунак 4 – Двухбаковы пояс

Чацвёрты від – двухбаковыя чатырохліцавыя паясы. Яны складваліся ўдвая, і кожны з бакоў выкарыстоўваўся як ліцавы (рысунак 5).



Рысунак 5 – Двухбакавы чатырохліцавы

Слуцкія паясы мелі па даўжыні дзяленне на дзве паловы або былі суцэльнымі, пры пвязванні складваліся ўдвая ці скручваліся. Кампазіцыйна паясы складаліся з трох частак. На канцах тканіны вылучаліся два прамавугольнай формы заканчэнні (“галовы”). Кожнае з такіх заваршэнняў вырашалася ў выглядзе адзіночных ці парных стылізаваных выяў вазонаў з кветкамі “сон-травы”, шыпшыны, васількоў, незабудак, гвааздзікі, піёнаў, букетаў, пераплеценых сцёблаў, парасткаў з лістамі, галінак дрэва, разнастайнай канфігурацыі медальёнаў.

Паміж “галовамі” знаходзіўся “сярэднік”, які ўтваралі папярочныя аднатонныя ці арнаментаваныя палосы, сеткавыя, “лусковыя”, “у гарошак” узоры. Уздоўж бакоў паясоў ішоў вузкі бардзюр, з раслінным, звітым у паласу арнаментам. Канцы ўсяго вырабу завяршаліся ўзорыстай стужкай (“шлячком”), матывы якой паўтаралі аздобу “сярэдніка”. Неад’емным элементам паясоў былі прашытыя махры. Іх велічыня мянялася і дыктавалася не толькі агульным выглядам тканіны , але і жаданнем заказчыка. У пераважнай большасці махры мелі ад 10–11 да 14–17 см.

Колеравыя спалучэнні слуцкіх паясоў будаваліся з перавагай залаціста-жоўтых, аранжавых, ружовых, блакітных, зялёных, карычневых і чырвоных тонаў.

Зыходзячы з асаблівай каштоўнасці слуцкіх паясоў, іх у канцы XVIII і ў XIX ст. пачалі шырока выкарыстоўваць у прадметах літаргічнага прызначэння – шылі вэлюмы, столы, бурсы, рабілі ўстаўкі ў арнаты і капы. З XIX ст. паясы сталі калекцыяніраваць як творы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Слуцкіх паясоў выробленых больш за 250 гадоў, захавалася даволі многа – няшмат у зборах музеяў Беларусі, больш за яе межамі – у Польшчы, Украіне, Расіі, Літве, Швецыі, Англіі, а таксама ў прыватных калекцыях.

***Заключэнне.*** Ацэньваючы мастацкія асаблівасці, дасканаласць тэхнічнага выканання слуцкіх паясоў, можна без сумнення прызнаць іх выключнае значэнне ў развіцці дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Здараецца на шляхах гісторыі, толькі на адлегласці часу бачна сапраўдная веліччыня здабыткаў даўніны. Менавіта так адбылося і са слуцкімі паясамі, якія цяпер нібыта нанава вяртаюцца ў сучаснае жыццё. Вельмі важна ўсведамляць, што далучанасць да мінулага – гэта не толькі знаёмства з мастацкімі шэдэўрамі, не толькі школа духоўнага, маральнага выхавання, але і неад’емная частка нашага грамадства, у пэўнай ступені ацэнка сапраўднай рэчаіснасці і нават адкрыццё будучыні праз прызму гістарычнага вопыту.

Ніводная нацыянальная культура не можа развівацца без апоры на свае карані, на гістарычныя традыцыі, з якіх жывяцца сілы для новых здабыткаў і дасягненняў. Слуцкім паясам было наканавана вяртанне да новага жыцця – у копіях, дэкаратыўна-прыкладных рэчах, у новых вобразах мастацтва.У рамках рэалізацыі Дзяржаўнай праграмы адраджэння тэхналогій і традыцый вытворчасці слуцкіх паясоў і развіцця нацыянальнай сувенірнай прадукцыі на прадпрыемстве “Слуцкія паясы” на 2012–2015 гг. Была завершана рэканструкцыя вытворчага корпуса па вуліцы Максіма Багдановіча, 8. Створана новая вытворчасць па вырабе копій, аналагаў слуцкіх паясоў, адкрыты Музей гісторыі слуцкіх паясоў, кафэ “Стары горад”, гандлёвы аб’ект “Сувенірная крама”.У сусветнай культуры слуцкія паясы маюць значэнне нацыянальнага сімвала Беларусі, па праву могуць лічыцца візітнай карткай нашай рэспублікі.

### *Спіс літаратуры*


*1. Беларусь, снежань 2014. Па слядах каштоўных рарытэтаў.*
*2. Беларуская думка №5, 2013 с. 40.*
*3. Беларускі гістарычны часопісы №4, 2012 с. 43-45.*
*4. Лазука Б.А. Слуцкія паясы і еўрапейскі тэкстыль. Малы лексікон/Мінск: Беларусь, 2015. – 170с.*
*5. Якуніна Л.І. “Слуцкія паясы” АН БССР. Мінск, 1960.*
*6. Слуцкі край 2014,28 студзеня. Вяртанне слуцкага пояса.*
*7. Слуцкі край 2015, 15 верасня. Залатканы цуд Случчыны.*


UDC 391

## REVIVAL OF TRADITIONS: SLUTSK BELTS


*Markelava A.V.*

*Belarusian State University of Informatics and Radioelectronics*
*affiliate Minsk Radioengineering College, Minsk, Republic of Belarus*

*Savchenko O.S. – teacher of the highest category*
*in Social and Humanitarian disciplines*


**Abstract.** The study of historical heritage enriches knowledge of history and national heritage. The study of the history of woven belts as a carrier of the ancient tradition of the Belarusian ethnic group. Slutsk belts are an interesting object of the small town of Slutsk, which has a national historical heritage.

**Keywords:** woven belt, Slutsk belt, tradition.